52524

1.52 524



I. ВЫДАНЬНЕ „НАШАЕ ХАТЫ“ I.

**Коштам Т. Г.**

*...„Сонцэ навукі скрось хмары цемные*
*Прагляне ясна над нашай нівою*
*І будуць жыці дзеткі патомные*
*Добраю доляй—доляй шчасьлівою.“*

МАРЫЯ КОНОПНІЦКА.

# ДЫМ

З РЫСУНКАМІ

*Перэтлумачыла* **Зязюля.**

**Цэна 4 кап.**

ВІЛЬНЯ.

Глаўны склад: Георгіеўскі праспэкт, 4. кв. 10.
кантора „НАШАЕ ХАТЫ.

1909.

I. 52. 524

BIBLIOTEKA NA[RODOWA]

Biblioteka Narodowa
Warszawa
30001017560908

Вільня, друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.

Колькі-б разоў не глянула ў вакно сваей станціі, толькі разоў магла яго бачыць, як валіў сінім слупам з вялікага коміна фабрыкі. Нераз знарок паднімала з над работы свае старые вочы, каб глянуці на яго хаця ў пералёце. А глядзела, бытцам песьціла, так ён быў ей люб. Людзі па дарозе ішлі, стрэчаліся і прахадзілі далей, пасьпешаючы ў розные бакі; рэдка хто глянуў на высокі комін фабрыкі, а слуп дыму прыкмечаў толькі дзесяты. Але для яе дым гэты быў не абы што: ён гаварыў, а яна яго разумела, бытцам жывога чалавека.

Калі залачком на чырвона-залацістым небе, дым, як ваўна чорная, клубіўся над комінам і пацягівала ад яго гаром, яна ведала, што яе Марцысь у катлоўні агонь у печы раскладае, дзьме, загнет падбаўляе, ён—міленькі яе сынок—высокі, тонкі, праворны, падперазаны рэменным паясом, у шапцы на

палавых валасох, у белым каўнерчыку кругом шыі.

— Ага,—шэптала тады матуля.—Марцысь разводзіць агонь...

І праўда, што развадзіў. Ведама, навічок спрытна сыпаў вугаль у печ, апаражняў адзін кош за другім, працаваў за сябе і за памочніка, горды, што яго называлі качагаром, а разам с тым, як бухнуў у печы агонь чырвоным полымем, вырываліся с крэпкай грудзі маладога качэгара песьні, ад катодых аж грымела ў катлоўні ад раньня да змроку.

Хутка чорные клубы дыму пачыналі бялець, рэдзелі, ставалі лёгкімі і ўжо роўным слупам ляцелі ў гару і толькі як хмарка бялелі на пагодлівам небе.

Ўдава прыкмечала гэту перамену, адхадзіла ад вакна і цешылася.

— Дзякаваць Богу, ўсё пайшло на лад!

Тады сама пачынала увіхацца па хаці, прыбірала сваю і сынову пасьцель, вымятала падлогу старай бярозовай мятлой, развадзіла ў грубцы агонь, падкідала трэсак, прыстаўляла гаршчкі і варыла палудзень.

І вось тады, як раз проці фабрычнаго коміна, паднімалася па небе тонкая, ледзь відочная, стужка сіневатаго дыму і лёганька вілася над комінам хаты, дзе жыла ўдава. А стужка тая была вельмі рэдзенькая, гэтак слабая, як дух старых грудзей, што яе раздымалі.

Малады качэгар нятолькі заўсягды прыкмечаў гэты дымок, але і сьмеяўся да яго! Іон добра ведаў, што там—пры грубцы—старая маці ў белым чапцу на галаве, ў кабаце падпаясана чырвоненькім фартушком, маленькая, дробная, сухая, згорбленая гатуе яму смачны боршч, або крупнік з акрасай. Бывала і так, што іншы раз здалося яму, што пах гэнай смачнай яды праз вуліцу далетае аж у катлоўню.

Тады Марцысь пачынаў працаваць з большай ахвотай і пакуль памочнік надумываўся, чухаў сабе патыліцу, ён, упёршыся нагоїі аб цадмуроўку, праворны і гібкі працаваў як-бы за двох.

Вось гэтак ішлі проці сябе два дыханьня: адно—фабрычнае, а другое—са станціі матчынай, прападаючы на небе, а, хто знае, можэ там яны і лучаліся нейдзе высока.

Каля палудня фабрычны дым пачынаў крыху рэдзець; грамадные лёгкіе машыны пыхцелі лягчэй, раз, другі загудзеў фабрычны гудок і наш дзяцюк як віхор прылетаў да хаты.

— Матуля, есьці!—крычаў ужо на парозе і, кінуўшы шапку на стол, бег да шпака, што ў клетцы біўся над вакном. Шпак, як толькі хлапца пабачыў, сьвістаў на падобу фабрычнаго гудка, а пасьля пачынаў насьвістываць тые песьні, якіх навучыў яго Марцысь; а Марцысь ставаў перад клеткай,

клаў рукі ў кішэнь і так сама пачынаў сьвістаць. Ад гэнаго сьвісту аж сьцены трасьліся.

Тым часам матуля засьцілала беленькі абрус з сінімі крайчыкамі і ставіла на стол глыбокую міску крупені або боршчу с каўбасай, або гарохоўкі з лапаткай, ці заціркі, як калі там што прыйшлося. Ля міскі клала булку хлеба—глаўную падмогу ў ядзе.

Чуць малец сеў за стол, хлеб неяк зараз прападаў. Іон рэзаў кусок за куском і, пасыпаючы сольлю, прыгаварываў.

— Добры хлеб, матуля!

— Добры, сынку—атказывала кожны раз ўдава.—Еш, на здароўе, еш! На хвалу Пана Езуса і Маткі Яго Найсьвентшай...

Хлапца ня трэба было прасіць: ён еў і разам с хлебам прападаў і боршч.

Матка ўжо падаўна перэставала есьці. Мешала ложкай у талерцы, падмухівала ў яе, але боршчу там неяк не зьменшалась. А калі хлапец спарадкаваў ужо ўсю міску і пачынаў абціраць рукавом губу, тады матка пытала:

— А можэ-б ты, сыночэк, ешчэ закусіў?... Я дык неяк ня маю ахвоты...

Хацела яму сказаць, што боршч не смакуе ей, але лгаць так Бога баялася, бо боршч такі быў слаўны.

— А но,—казаў хлапец,—калі мама не ясі...

Матка хутчэй падстаўляла яму сваю талерку.

— Еш, дзіцятка, еш! На хвалу Пана Езуса...

Хлапец браў зноў ложку і пачынаў есьці па свойму.

— Чаго мама хочэ ад гэнаго боршчу?— пытаў.—Тож бадай зусім каралеўскі боршч!

— Быў бы ён каралеўскі, быў бы, сынку,—атказывала ўдава, міргаючы вачамі,— вось, толькі крыху бабковаго лісьцьця мне не хапіла.

Бывала, што хлапец не падалеў усяму.

Тады ўлівала астаткі боршчу ў гліняную міску і ставіла ў папялок цёплы так, каб сын не угледзеў.

Гэные астаткі яна лічыла за сваю ўласнасьць і, калі хлапец шоў да фабрыкі, яна выймала с печы гліняную міску ды даедала іх з астаўшыміся крошкамі хлеба.

Ўсё гэта мігам рабілася. Малады качэгар мала меў часу на палудзень і мусіў пасьпешаць. Ледзь з'еў, жэгнаўся, цалаваў матку ў запрацаваную руку, браў шапку і сьвіснуўшы прад клеткай шпака, выбегаў са станціі, — і ў трох падскоках быў ужо на вуліцы. Ўдава тады абрусік зьнімала і, складаючы яго, стаяла сярод хаты і наслухівала крыху с трывогай, а разам цешучыся, грукату сынавых ног.

— Сьвяты Антоні!—казала, круцячы галавой,—гэтак ляціць! Ногі калі небудзь паламае, сходы паразьбівае...

І стаяла так слухаючы, пакуль ня грукнулі ў нізе дзьверы сеней і не заціхла эха

тупату гэных маладых і сільных ног. Тады хавала абрус, мыла статкі, загрэбала і, сеўшы ля вакна, абшывала і лапіла сынаву адзежу і бялізну.

Калі было лета, дык доўга магла цешыцца дымам, што валіў с фабрычнаго коміна. Бывала так: іншы раз загледзіцца на яго, што работа выпадзе з рук...

Іон дзіўна перэменяў свой колёр і кшталт.

То як жалезны вуж віўся і круціўся што раз далей, што раз вышэй, то як лёгкі мусьлён летаў па ветры, чырванеючы над комінам, то як дым с кадзідла шоў у гару і мягка кудрыўся па берэгох, то як вялікі пук перья пакручэнаго валіў пад неба, хістаючыся пад вецер, то перэменяўся ў нейкіе дзіўные мары няземные.

Часам вецер раздуваў яго бытцам палатно, або парус вялікаго карабля; часам разрываў і путаў, бытцам клубы пакульля, часам гоніць яго, як які туман чырнявы. А бывала пад непагоду, дык вісіць цяжкай хмарай над фабрыкай і мягка сьцеліцца па дахах дамоў і бадзяецца над зямлёй, ня ведаючы куды дзецца.

Калі прыходзіла зіма, дык ўдава паліла лямпу і пры ёй рабіла грубымі пруткамі паньчохі на прадажу.

Але хаця ад вакна ішло холадом і нераз адтуль да хаты далеталі клубы халоднаго ветру і сыпала шронам, аднак яна што

раз падхадзіла да вакна, каб міргом хацця глянуці на фабрыку.

Сьвецілася яна проці хаткі нашай ўдавы доўгім шнуром сьветлых вокон, грымела



работай сваіх вялізных машын, бражджала жалезам, зьвініла малатамі, зьвякала пілам і, сычэла распалёным жалезам. Вечаром дым

чырвоным агнём валіў с коміна па цёмным небе і кідаў снапы зорак ва ўсе бакі...

Шырока луна гарэла на небе, а блеск ад яе ішоў гэтак далёка што здавалося бытцам днеець нейдзе...

Ўдава глядзела і думала. З думак гэтых нераз будзіў яе шпак, каторы, спужаўшыся блеску, які заглядаў с фабрыкі ў вакно станціі, пачынаў насьвістываць так сама свае песьні, як і ў дзень. У хаці тады рабілася весялей, агонь трашчаў у грубцы, а шпак аж да глухаты дзёр сабе горла. А каліж пад поўнач выплываў белы месяц, уся фабрыка, гарэўшая агнямі, таяла ў яго сярэбраным блеску.

Позна вечаром варочаўся сын і ешчэ на парозе крычаў.

— Матуля, есьці!...

А разам з яго маладой і сільнай фігурай ухадзіла ў хату вясельле, сьмех і свабода. Цяперака ён еў ужо не так скора, а менш пасьпешаючы, ды ад часу да часу гутарыў с маткай то аб тым, то аб сім. Пад'еўшы пачынаў шырока зеваць, пацягівацца,—навэт шпак тады не цівавіў яго.

— Ідзі спаці, сынку, ідзі спаці!—казала матка, гладзючы па яго галаве.—А гэта-ж заўтра ізноў да дня трэба...

— Пойду, матулька,—атказываў сонным галасам—намардаваўся так, што аж га!...

— А пацераў, сынку, не запомні згаварыць—прыпамінала ешчэ.

— Добра, добра матуля.

Цалаваў яе ў руку, прыкленкаў перад сваім тапчанам пад абразом ды, схіліўшы галаву на ладоні скора, скора ў поў голаса пачынаў маліцца, ўсё пераплетаючы пацеры галосным пазеваньнем; пасьля біўся ў грудзі, жэгнаўся і, скінуўшы хутчэй апратку, клаўся на цьвёрдую пасьцель.

Засыпаў тэйчас, а ў хатцы даўно ўжо было чутно яго роўнае глыбокае дыханьне, калі матка ешчэ пацеры шэптала прад пачарнеўшым абразом Маткі Найсьвентшай.

Наканец, лямпа гасла, шпак перэставаў біцца ў клетцы, адным словам, усё уціхала, каб заўтра ледзь дзень зноў праснуцца і на нагі падняцца.

А з гэным уставаньнем заўсягды была беда. Ўдава спала сном кароткім, чуткім, сном людзёў старых, што толькі дрэмлюць, а не сьпяць,—можэ дзеля таго, каб збярэч адну-другую гадзіну жыцьця прад вечным сном магілы.

Са сну гэтаго яна будзілась зараз пасьля другіх пятухоў,—шмат часу прад першым фабрычным гудком і, злесшы с пасьцелі, пачынала кратацца па хаці, рыхтуючы паліўку сыну ды шэпчучы малітвы. Як раз тады ў вакно заглядала вялікая ранняя зорка і кідала свой сьвет на твар заспанаго сына. Матка што раз паглядала на гэну твар, хацелабы разбудзіць свайго пястунчыка, але шкадавала.

—Нехай,—шептала ў поў голоса.—Нехай пасьпіць ешчэ крыху.

І толькі тады, як азваўся фабрычны гудок, клікала хлапца:

— Марцысь! А!.. Марцысь! Уставай, сынку, сьвісьціць.

А Марцысь адварачываў галаву да сьценкі.

— Гэта шпак, матуля... марматаў ён.

— Які шпак! Гэна ўжо ў фабрыцы сьвісьцяць, а не шпак.

Пацягіваўся, накрываў галаву, марматаў, але матка не адхадзіла, бо начная зьмена кончылася, а качэгар мусіў прыйсьці на сваё мейсцэ перад тым, як прыходзяць работнікі. Гэтак было што дзень, нават і ў нядзелю.

Нeяк раз, залачком ешчэ, малец с крыкам разбудзіўся ды і сеў на пасьцелі.

Матка была ўжо пры ім.

— Што табе? Што табе, мой міленькі?—пытала яна жаласьліва.

Не атказываў. Глядзеў вялікімі вачамі, губы трасьліся, галава мокрая ад поту. Толькі пад расьцёгнутай кашуляй можна было чуць і бачыць, як сэрцэ бьецца ў ґрудзі, быцам тая птушка ў клетцы.

— Што табе, мой сынку? Што?—ды туліла яго да сябе, як якое дзіця малое.

Доўга ня мог ачунець.

— Нічога, матуля,—пачаў нарэшце гаварыць,—нічога. Толькі прысьнілася мне... што... ў мяне ўдарыў пярун.

Ўдава струхлела аднак. Трывогі сыну не паказала. Хацела казаць нешта, але голас як-бы ўвяз у горле.

Хлапец сядзеў на тапчане выпраставаны ды глядзеў прад сябе перэпужанымі вачамі.

— Пярун, матуля—казаў ціхім надарваным голасам, такі чырвоны, страшны як ґад. У грудзі ўдарыў!!..

Замоўк і голасна дыхаў.

Матка першая апомнілася.

— Ну дык што, сынку—казала гладзючы яго гарачы твар,—ды што там! Сон мара—а праўда у Бога. Успакойся дзіцятка!!

А калі у хлапца пачалі голасна лязгаць зубы, прысела бліжэй, прытуліла галаву да сваіх прысохшых грудзей ды гэтак пачала калыхаць яго, як калісь... даўно... даўно.

Наканец такі хлапец успакоіўся,—пачаў марыць яго сон.

— Нехай матуля ўжо ідзе—сказаў—нехай матуля ідзе і ляжэ,... і я засну...

Але заснуць не прыйшлося. Лежаў, аткінуўшы галаву назад, с шырока аткрытымі вачамі, ды толькі і глядзеў на зоркі, што гаснулі на ўсходзе.

Матка тымчасам глянула на свайго сына раз, другі і такі ня вытрымала, каб не спытацца.

— А што, дзіцятка, сон не змарыў?

— Не, неяк не магу заснуць, — атказаў гэткім ціхім голасам, што ў ім была чутна скарга.

Падайшла і села пры ім.

Не журыся, міленькі, не маркоцься. Нягож на тое добры Божэнька пяруны ў небе мае, каб імі забіваць сына беднай ўдавы? Напэўна не дапусьцяць да гэткай крыўды ні Пан Езус ні Панна Найсьвентшая... А я табе во што скажу: пярун значыць вясельле, калі сасьніцца дзяцюку, або дзеўцы. Гэтак напісана ў маей кніжцы, што сны гадае.

Разсказывала весела, падчас сьмяючыся, а рукой касьлявай вадзіла па яго лбу і гладзіла валасы, ажно хлапец успакоіўся наканец і сам пачаў усьмехацца.

— Дык кажэш, матуля, вясельле? — пытаўся.

— А ведама ня што іншае. Вясельле, вясельле...

Задумаўся хлапец і пасьля сказаў:

— Ну, каліж так, то трэба ўставаці, матуля.

— Ўставай, сынку, ўставай.

Згатую табе сьнеданньне. Пад'ясі, страх міне, ўсё пройдзе.

І праўда ўсё перайшло. Гэтай раніцай у хаці нават было неяк весялей, як заўсягды, бо хлапец меў досі часу і сьвістаў песьні адну за другой на выперадкі са шпаком, ажно птушка ахрыпла і, калі дайшло да Зосі, што ей ягадак хацелася, так сіпата сьвістаў, што і матка і Марцысь насьмеяліся досі;—і так вясёлы выйшоў хлапец на работу. За сынам і матка падайшла да дзьвярэй ды і

наслухівала яго шагоў. Лёгкіе былі і свабодные, ведама маладые ногі. Навэт падгніўшые і крывые сходы не скрыпелі сягоньня, як заўсягды. Толькі калі хлапец дзьверы ў сенцах за сабой зачыніў, нешта ей ў грудзёх і сэрцы залекацела; апанаваў яе страх. Стук дзьвярэй быў такі глухі, бытцам выхадзіў з глыбі зямлі і страшным эхам праґрымеў у пустых сенях. Падбегла да вакна, каб ешчэ раз глянуці за сынам.

Ішоў ён лёгка, сьпешна з задзёртай галавой, а калі меўся ўжо вайсьці ў браму фабрыкі, агляну́ўся назад у гару. Можэ ў вакно хаткі, а можэ толькі гэтак здалося маці...

Хутка пасьля і чорны дым пачаў валіці с фабрычнаго коміна.

Час прахадзіў... У хатцы, чыста прыбранай, зрабілася ціха. Стары гадзіннік с кветкамі, намаляванымі на жоўтым цыфэрбляці, цыкаў роўна; шпак прабаваў сьвістаць найвесялейшые свае песьні ахрыплым голасам, а ўдава, быць можэ думаючы аб сьне сына, што прарочыў вясельле, перасушывала сваю сьвятачную адзежу.

Нараз пачула страшэнный грукат. Затрэскацелі сьцены, кавалкі гліны пасыпаліся с коміну. Вялікі, агністы слуп дыму бухнуў у неба з градам цэглоў і кавалкамі фабрычнаго коміна. Ў хаці засьвецілася чырвоным блескам. Ўдава, як стаяла, так і абамлела. Ні воднаго слова не прашэпталі яе збялеў-

шые вусны. Толькі сівые валасы падняліся над лбом, толькі вочы падвярнуліся як у нябошчыка... Вот пярун!...

Быць можэ навэт не пачула дзікаго крыку, што падняўся на вуліцы.

— Качэгар!... Забіла качэгара!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Доўгіе ешчэ гады пасьля таго сядзела ў гэтым самым ваконцы, гледзючы смутнымі, асалавеўшымі вачамі на новы фабрычны комін, с каторагo па даўнаму ляцелі ў гару клубы чорнаго дыму.

Толькі ён цяпер ў яе вачах не перэменяў сваіх кшталтоў у вясёлые абразкі, а часта прэдстаўляў ей мглісты від яе дараго-га хлапчэняці. Тады паднімалася бедная матка, рукі да яго працягівала... А вецер разнасіў дым і гнаў яго нейдзе высока пад неба....

BIBLIOTEKA NAUK

## Год IV выданьня „НАША НІВА“ 1909 год.

**Першая беларуская газэта з рысункамі.** Выходзіць рускімі і польскімі літэрамі.—Прымаецца падпіска на 1909 г.—У гэтым гаду „НАША НІВА“ выходзіць у новым выгаднейшым формаце.

„**Наша Ніва**“ паставіла сабе мэту будзіць у беларусоў пачуцьце чалавека і грамадзяніна, голасно гаворыць аб яго патрэбах і правох.

„**Наша Ніва**“ едзіная газэта ў краю, каторая мае карэспандэнтоў бадай з усіх мястэчак і шмат з якіх вёсак; у гэтых карэспандэнціях, як у люстры, відаць усё жыцьцё нашых дагэтуль забытых беларусоў.

„**Наша Ніва**“ ўсе новые думскіе законы, каторые датыкаюць Беларусі, разбірае і ацэнівае жывымі прыкладамі з жыцьця Беларускаго краю.

„**Наша Ніва**“ тлумачыць сваім чытацелём усё, што робіцца на цэлым сьвеці і ў Расеі.

„**Наша Ніва**“ друкуець практычные гутаркі аб гаспадарцы.

„**Наша Ніва**“ тлумачыць, як нарыхтаваць розные культурные справы (коопэрацыі, сельскіе банчкі, бібліотэкі і др.).

„**Наша Ніва**“ ў „Пачтовай скрынцы“ дае атказы на ўсе пытаньня, тлумачыць законы, пdescribed добрые кніжкі беларускіе, польскіе, рускіе і др.

**ЦЭНА с перасылкаю і дастаўкаю да хаты:**

На 1 год—2 руб. 50 кап., на 1/2 года—1 р. 25 к.,на 3 мес.—65 кап. на 1 мес. 25 к. За граніцу на 1 год—4 р., на 1/2 года—2 руб.

*Рэдактор-Выдаўца* А. ЎЛАСОЎ.

Адрэс Рэдакціі і Канторы: *Вільня, Віленская № 20.*

BN
BIBLIOTEKA NARODOWA
52524
Biblioteka Narodowa
Warszawa
30001017560908